УДК 908:06.7(476)323.329«1920»

**А. У. Дзянісаў**, асістэнт (БГТУ)

# УПЛЫЎ ЕЎРАПЕЙСКАГА РЭГІЯНАЛІЗМУ НА КРАЯЗНАЎЧЫ РУХ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1920-Я ГГ.

У артыкуле праводзіцца аналіз уплыву еўрапейскага рэгіяналізму – шырокага навукова-інтэлектуальнага руху на дзейнасць краязнаўчай працы ў БССР у 1920-я гг. І краязнаўчы рух, і рэгіяналізм маюць пэўныя агульныя тэндэнцыі, аднак яны адрозніваліся пэўнай спецыфікай і ўмовамі сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця. Спроба параўнання гэтых дзвюх адметных з'яў робіцца ўпершыню. Трэба зазначыць, што, нягледзячы на спецыфіку палітычнага і ідэалагічнага клімату ў БССР, рабіліся спробы даследавання вопыту еўрапейскага рэгіяналізму і яго рэалізацыя на практыцы.

The article analyzes the impact of European regionalism on the development of local history movement Soviet Belarus in 1920. Despite the ideological orientation of Soviet society and the policy of the authorities, he European regionalism evoked great interest in the Belarusian local history. In addition, both movements had many common trends and principles of operation, primarily popularizing local history and culture, the study of the socio-economic conditions of the regions. However, this experience has not been used in local lore fully due to the specific policy BSSR.

**Уводзіны.** У сённяшніх умовах рэгіяналізм адыгрывае даволі вялікае значэнне ў разнастайных сферах: ад культурнай і эканамічнай да палітычнай (пашырэнне актыўнасці грамадства, фарміравання органаў мясцовага самакіравання, лакальнай дэмакратыі і інш.). Працэсы рэгіяналізацыі грамадства маюць выразнае культурнае вымярэнне, роля якога для Рэспублікі Беларусь з яе непаўторнымі нацыянальнымі мясцовымі асаблівасцямі ўяўляецца даволі значнай. У сувязі з гэтым наспявае патрэба ў даследаванні гісторыі разнастайных рэгіянальных праектаў у Беларусі ў XX ст. Асаблівую цікавасць ўяўляе сувязь паміж еўрапейскім рэгіяналізмам і краязнаўчым рухам у Савецкай Беларусі ў 20-я гг. XX ст. Першая спроба правядзення пэўных паралеляў і вызначэнне ступені ўплыву была здзейснена даследчыкамі А. А. Гужалоўскім і І. І. Бамбешкам. Разам з тым аўтары, на нашу думку, паставілі пад спрэчнасць сцвярджэнне аб краязнаўчым руху БССР як унікальнай з'явы, што з'яўляецца не зусім дакладным [1, с. 61]. Калі казаць пра «ўнікальнасць з'явы краязнаўчага руху», то маецца на ўвазе ў першую чаргу яго масавасць (першае месца па колькасці ўдзельнікаў і па колькасці краязнаўчых арганізацый сярод рэспублік Савецкага Саюза), па-другое, па наяўнасці прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты і інтэлігенцыі (больш за 70%), па-трэцяе, па выніках працы як кіруючых органаў, так і краязнаўчых арганізацый на месцах (аб чым неаднаразова падкрэслівалася самой акадэмічнай навукай, у першую чаргу Інбелкультам), па-чацвёртае, па распрацаванай і дзейснай сістэме каардынацыі краязнаўчай працай па ўсёй тэрыторыі рэспублікі. Такім чынам, не адмаўляючыся ад фенаменальнасці краязнаўчай справы дадзенага перыяду, мы, тым не менш, мы ставім мэтай прасачыць ступень уплыву еўрапейскага рэгіяналізму на развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 20-я гг. XX ст. Бо нават самая арыгінальная і самастойная ідэя ці з'ява не нараджаецца ў вакууме, а прарастае на ўжо аб'ектыўна існуючай інтэлектуальнай глебе, карані якой маюць цеснае перапляценне.

**Асноўная частка.** Падзел еўрапейскага кантынента на рэгіёны з'яўляецца адной з яго характэрных рысаў. Рэгіён – гэта геаграфічнае і этна-культурная частка больш вялікага блоку, да якога ён, тым не менш належыць. Регіён уяўляе сабой прастору, якая падыходзіць да чалавечага жыцця, з'яўляецца спадкаемцай старажытнай гісторыі, забяспечвае самабытнасць, блізасць, еднасць і адыгрывае ролю процівавесу касмапалітычнаму і бюракратычнаму цэнтралізму. Регіяналізм як шырокі агульнаеўрапейскі інтэлектуальны рух сфарміраваўся ў XIX ст. у Францыі. Распачынальнікам дадзенага руху лічыцца французскі і правансальскі даследчык і літаратар Ф. Містраль. Трэба адзначыць, што ў дадзены перыяд у Францыі пачынаюцца тэндэнцыі глабалізацыі эканамічных адносін, якія выклікаюць заняпад мясцовых промыслаў, вытворчасці, ладу жыцця і народнай культуры. Гэта не магло не выклікаць занепакоенасць сярод інтэлекутальных колаў грамадства. Містраль на чале з інтэлектуаламі і буржуазіяй Praванса пачаў намаганні па захаванню культурных асаблівасцяў і папулярызацыі правансальскага дыялекту, у выніку чаго быў створаны музей Арлатэн, Музей правансальскай народнай культуры, выдадзены шэраг слоўнікаў, часопіс «Альманах Praванса», сабраны шматлікія калекцыі і інш.

Роскві́т еўрапейскага рэгіяналізму прыйшоўся на 1920-я гг. Сярод мэтаў, якія ставіліся рэгіяналістамі былі папулярызацыя навуковых ведаў і даследчай дзейнасці, стварэнне неабходных умлў для развіцця правінцый, абуджэнне

ініцыятывы ў мясцовага насельніцтва і ўцягванне яго ў самакіраванне. Важна падкрэсліць, што рэгіяналізм не тоесны сепаратызму, паколькі выступае за захаванне ўнікальных частак у фармаце адзінага цэлага. У кароткі перыяд было створана шмат розных праграм дзейнасці рэгіянальных арганізацый. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці былі адміністрацыйны (пераразмеркаванне дзяржаўнай улады з цэнтра ў рэгіёны), эканамічны (развіццё мясцовай прамысловасці і рэгіянальнай эканомікі ў цэлым) і культурны (развіццё народнай мовы і культуры). Асабліва актыўна развіццё рэгіяналізму адбывалася ў дзяржавах Усходняй і Паўночнай Еўропы, якія атрымалі суверэнітэт па выніках Версальскага міру: Польшча, Чэхаславакія, Фінляндыя, Літва, Латвія, Эстонія. Праца рэгіяналістаў там была накіравана на аргументацыю ўласных нацыянальных асаблівасцяў, багацце айчыннай культуры, развіццё мясцовых эканамічных і адміністрацыйных частак. Там рэгіянальныя даследаванні служаць мэце нацыянальнага адраджэння і эканамічнага развіцця асобных рэгіёнаў, маюць значную дзяржаўную патрымку.

У пачатку 1920-х гг. у Беларусі адбываецца зараджэнне і станаўленне сацыяльнай і культурнай з'явы – краязнаўчага руху. Асаблівая роля ў гэтым працэсе належала нацыянальнай інтэлігенцыі, у першую чаргу працаўнікам асветы і навукі. Галоўным стымулам для актывізацыі дзейнасці краязнаўчых таварыстваў стала набыццё Беларуссю ўласнай дзяржаўнасці і перспектыва нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва.

Генезіс краязнаўчага руху ў БССР пачаўся ў 1920 г., калі ў добраахвотных краязнаўчых таварыстваў з'явілася магчымасць легалізаваць сваю даследчую дзейнасць. У 1924 г. пры Інбелкульце было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (далей – ЦБК), якое ажыццяўляла кіраўніцтва ўсёй краязнаўчай працай рэспублікі. У 1928 г. краязнаўчы рух БССР набыў масавы характар (каля 10 000 членаў краязнаўчых арганізацый па ўсёй рэспубліцы). Карысць у дзейнасці краязнаўчых таварыства прызнавала і кіраўніцтва рэспублікі, імкнулася аказваць ім пасільную падтрымку.

У 1925–1927 гг. намаганнямі Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК) была створана разгалінаваная сетка краязнаўчых арганізацый, якая паступова ахапіла ўсю тэрыторыю БССР. Навукова-даследчая дзейнасць краязнаўчых таварыстваў ажыццяўлялася па тэрытарыяльным прынцыпе (акруговае таварыства краязнаўства адказвала за вывучэнне акругі, раённае – за раён, гурток – за частку раёна). Інтарэсы і накірункі дзейнасці мясцовых краязнаўцаў адрозніваліся надзвычайнай шырынёй, яны праводзілі маштабныя археалагічныя, этнаграфічныя, батанічныя, геалагічныя экспедыцыі, ажыццяўлялі збіральніцкую, асветніцкую, выдавецкую, прырода- і культура-ахоўную дзейнасць. Галоўнай мэтай дзейнасці краязнаўчых арганізацый было ўсебаковае вывучэнне Беларусі. Істотнай рысай краязнаўчага руху 1920-х гг. з'яўлялася яго непарыўная сувязь з культурным і грамадска-палітычным жыццём рэспублікі, актыўнымі ўдзельнікамі краязнаўчага руху з'яўляліся вядомыя дзеячы навукі і культуры.

Шматлікія прадстаўнікі інтэлігэнцыі, якія з'яўляліся членамі краязнаўчых арганізацый і актыўна ўдзельнічалі ў краязнаўчым руху, з'яўляліся ў 1920-х гг. аб'ектамі дзяржаўнай палітыкі. Аўтар не ставіў мэту паказаць увесь аб'ём напрамкаў гэтай палітыкі, былі закрануты толькі тыя аспекты, якія адносіліся да краязнаўчага руху, кіраўніцтва і нагляду за яго развіццём і дзейнасцю.

На студзеньскім пленуме ЦК КП(б)Б 1925 г. было адзначана: «Лозунг, які КП(б)Б павінна прыняць у культурнай працы, – лозунг беларусізацыі» [2, с. 201]. Вывучэнне Беларускага краю, а ў першую чаргу яго гісторыі і культуры, мела ва ўмовах своеасаблівага «нацыянальнага адраджэння» пад кіраўніцтвам партыі надзвычайны сэнс. Вынікі дзейнасці краязнаўчых даследаванняў маглі мець вялікую карысць у справе адраджэння Беларусі. Рэзалюцыя «Аб нацпалітыцы» пленума Цэнтральнага камітэта КП(б)Б, прынятая 1 кастрычніка 1925 г., адзначала: «Маючы на ўвазе выключны сэнс Інбелкульта, пленум даручае Бюро ЦК узмацніць апошні партыйнымі работнікамі, а акружным камітэтам – звярнуць асабістую ўвагу на краязнаўчыя таварыствы і на вярбоўку карэспандэнтаў для Інбелкульта» [2, с. 181].

У той жа час правядзенне беларусізацыі пастаянна стрымлівалася кіраўніцтвам КП(б)Б з-за магчымасці ўзнікнення ў яе ходзе розных нацыяналістычных ухілаў. Перад партыйнымі арганізацыямі ставілася задача забеспячэння «бальшавіцкай лініі» у вырашэнні нацыянальнага пытання, беларусізацыі, узмацнення барацьбы супраць праяў варожай ідэалогіі.

Сярод тэндэнцый, якія зрабілі вялікі ўплыў на станаўленне краязнаўчага руху, можна з ўпэўненасцю канстатаваць, што ў пачатку 1920-х гг. асноўнай крыніцай выступала краязнаўства РСФСР. У той жа час у РСФСР адбыліся у Маскве вызначальныя для расійскага краязнаўчага руху падзеі. 12–20 снежня 1921 г. адбылася першая Усерасійская краязнаўчая канферэнцыя. Арганізацыю і правядзенне гэтай канферэнцыі ўзяў на сябе ўтвораны ў лютым 1921 г. Акадэмічны цэнтр. Канферэнцыя насіла назву, «Першая Усерасійская канферэнцыя таварыстваў па вывучэнню мясцовага краю», якая, на думку

арганізатараў, павінна была паспрыяць аб'яднанню ўсёй краязнаўчай працы на аснове дзяржаўнага будаўніцтва. У ёй прымалі ўдзел як шматлікія прадстаўнікі краязнаўчых таварыстваў з правінцый, так і вядомыя дзеячы навукі, культуры і асветы. Сярод удзельнікаў канферэнцыі ў Маскве прысутнічалі і прадстаўнікі краязнаўчых таварыстваў іншых савецкіх рэспублік. Дэлегатамі ад Беларусі на канферэнцыі былі І. У. Пічэта і М. Г. Маслаковец. Безумоўна, ідэя аб'яднання ўсіх краязнаўчых сілаў краіны, стварэнне каардынацыйнага цэнтра па прыкладзе РСФСР выклікала ў беларускіх краязнаўцаў вялікую ініцыятыву. Аб уплыве маскоўскай канферэнцыі сведчаць наступныя падзеі.

10 студзеня 1922 г. адбыўся аб'яднаны сход прадстаўнікоў Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцяў Беларускага вольна-эканамічнага і Мінскага педагагічнага таварыства. На сходзе быў заслуханы даклад аб Першай краязнаўчай канферэнцыі і абмеркаваныя яе вынікі. Было пастаноўлена даручыць аб'яднанаму праўленню таварыстваў прыняць меры па скліканні Агульнабеларускай канферэнцыі краязнаўчых таварыстваў. Было створана і Часовае бюро краязнаўства, у якое ўвайшлі прадстаўнікі аб'яднанага праўлення. На канферэнцыі планавалася выпрацаваць асноўныя напрамкі дзейнасці краязнаўчых таварыстваў па вывучэнні Беларусі. Менавіта прынцып аб'яднання аматарскага краязнаўства пад кіраўніцтвам акадэмічнай навукі, усебаковага вывучэння як вытворчых сіл краіны, так і гісторыі, культуры краіны павінен быў рэалізавацца ў пачатку 1922 г.

Аднак тэндэнцыі пачынаюць змяняцца ўжо да сярэдзіны 1920-х гг. Спробы даследавання метадаў краязнаўчай працы, а значыць і рэгіяналізму ў краінах Еўропы, звязаны з асобай Мікалая Каспяровіча, асобы, якая грала выключную ролю ў краязнаўчым руху БССР. Яшчэ ў 19-гадовым узросце ён уключыўся ў беларускі нацыянальны рух. У лістападзе 1918 г. уступіў у шэрагі беларускай грамадска-палітычнай арганізацыі «Маладая Беларусь». Разам з гэтай арганізацыяй потым далучыўся да беларускіх эсэраў. У 1919 г. паступіў у Мінскі настаўніцкі інстытут, які потым быў рэарганізаваны ў Інстытут народнай асветы. У 1919–1920 гг. ён быў інструктарам Часовага нацыянальнага камітэта і Цэнтральнай беларускай школьнай рады, удзельнічаў у падполлі падчас польскай акупацыі. З 1922 г. ён уваходзіў у склад Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцей. Менавіта гэтае таварыства выступіла ў 1922 г. ініцыятарам склікання першай Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі.

У пачатку жніўня 1924 г. па загадзе Наркамата асветы М. Каспяровіч быў пераведзены ў Віцебск, а затым узначаліў краязнаўчае таварыства ў Віцебску. Актыўная дзейнасць на ніве краязнаўства не засталася незаўважанай. Восенню 1926 г. М. Каспяровіч пераехаў у Мінск, дзе заняў прапанаваную яму пасаду сакратара ЦБК. Там ён прысвяціў сябе арганізацыйна-метадычнай працы, шмат часу ўдзяляў этнагарафічным даследаванням, асветніцкай дзейнасці і прапагандзе ідэй краязнаўства. З 1929 г. заняў пасаду намесніка старшыні ЦБК.

Таксама М. Каспяровіч вельмі актыўна вывучаў дзейнасць краязнаўчых таварыстваў краін замежжа. З гэтай нагоды ім былі здзейснены камандзіроўкі ў Фінляндыю і краіны Прыбалтыкі. Вынікі гэтай паездкі і вывучэння вопыту краязнаўцаў былі надрукаваны ў часопісах «Наш край», «Краязнаўства» ЦБК РСФСР і іншых перыядычных выданнях. Асаблівую ўвагу Каспяровіч надаў вывучэнню краязнаўства Фінляндыі, метадам працы фінскіх рэгіяналістаў, стану музеяў і інш.

Матэрыялы навукова-даследчай працы па вывучэнні гісторыі краязнаўчага руху ў Беларусі і яго сучасных дасягненнях у БССР і за яго межамі нарэшце былі аб'яднаны М. Каспяровічам у манаграфію. Манаграфія «Краязнаўства. Нарысы» была выдадзена ў 1929 г. Яна змяшчала даследаванні гісторыі развіцця краязнаўства ў Беларусі, аналіз стану сучаснага краязнаўства ў БССР, а таксама метадычныя матэрыялы, якія займалі большую частку кнігі.

Ва ўводзінах М. Каспяровіч правёў акрэсленую мяжу паміж паняццямі «радзімазнаўства», «беларусазнаўства» і «краязнаўства». Па разуменні даследчыка першыя два тэрміны былі звязаны з вывучэннем і пазнаннем усёй Беларусі. А мэта краязнаўства – комплекснае вывучэнне менавіта «краю». Край трактаваўся, як адносна невялікая тэрыторыя, частка краіны. Тэрытарыяльна паняцце «краю» супадала з акругамі, на якія была падзелена тэрыторыя БССР.

На жаль, назапашаны да канца 20-х гг. XX ст. вопыт па вывучэнні еўрапейскага рэгіяналізму так і не быў выкарыстаны ў поўнай меры, хаця такія спробы М. Каспяровіч рабіў. У канцы 1929 г. пачынаецца рэзкі паварот да барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам, крытыцы гэтых тэндэнцый у краязнаўчай працы. Сам Мікалай Каспяровіч у сувязі з абвінавачваннямі быў вызвалены са ўсіх пасад і апынуўся пад следствам. У гэтых умовах у дзейнасці ўсёй Беларускай акадэміі навук (далей – БАН) і ЦБК прынцыпы вывучэння вытворчых сілаў, асвятленне поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва і яго галоўных дасягненняў – калектывізацыі і індустрыялізацыі выходзяць на першы план.

**Высновы.** Такім чынам можна казаць, што рэгіяналізм, яго прынцыпы і метады працы

не засталіся без увагі ў дзеячаў краязнаўчага руху Савецкай Беларусі ў 1920-я гг, у першую чаргу актыўнага дзеяча, тэарэтыка і практыка краязнаўства М. І. Каспяровіча, які прысвяціў вывучэнню рэгіяналізму некалькі афіцыйных камандзіровак за мяжу, а вынікі сваёй працы апублікаваў у шэрагу артыкулаў і прысвяціў гэтаму частку сваёй фундаментальнай грунтоўнай манаграфіі «Краязнаўства». Разам з тым, сярод асноўных уплываў на краязнаўчы рух можна па-ранейшаму канстатаваць расійскае краязнаўства і агульнасаюзныя тэндэнцыі ў навуковым, сацыяльна-культурным і палітычным развіцці.

Краязнаўчы рух меў даволі шмат агульных рысаў, якія аб’ядноўвалі яго з рэгіяналізмам. Абодва рухі з’яўляліся інтэлектуальнымі плынямі, абодва мелі сваёй мэтай комплекснае даследаванне тэрытарыяльнай адзінкі (паняцце край амаль тоесна паняццю рэгіён), праводзілі разнастайную дзейнасць па папулярызацыі, падтрымцы і захаванні мясцовых асаблівасцяў, вывучэнні мовы, культуры, прырода-геаграфічных умоў. Абодва ажыццяўляліся прадстаўнікамі інтэлектуальнай часткі грамадства (інтэлектуалы еўрапейскіх рэгіёнаў і інтэлігенцыя Савецкай Беларусі), абодва рухі падтрымліваліся дзяржавай. З адметных рысаў можна выдзеліць тое, што краязнаўчы рух БССР быў значна больш ідэалагізаваны і цэнтралізаваны ў адрозненне ад шматлікіх, даволі аўтаномных рухаў і арганізацый Заходняй Еўропы. На жаль, з-за палітыкі савецкіх уладаў краязнаўцы пазбавіліся магчымасці выкарыстаць вопыт еўрапейскіх рэгіяналістаў.

**Літаратура**

1. Гужалоўскі А. А., Бамбешка І. І. Да пытання аб уплывах рэгіяналізму на дзейнасць краязнаўцаў Беларусі ў 1920-я гг. // Образцы прошлого в историографии: белорусского-французский диалог. Сборник материалов к международной науч. практ. конф.: «Историография как объект исследования». Минск, 21–22 мая 2008 г. / ред. кол.: А. Н. Алпеев [и др.]. Минск: ЗАО «Веды», 2008. 164 с.

2. Идеологическая деятельность компартии Белоруссии, 1918–1945: сб. документов. в 2 ч. Ч. 1. / сост. Н. С. Сташкевич [и др.]. Минск: Беларусь. 1990. 358 с.

3. Касперович Н. И. Краеведение в Финляндии // Краеведение. 1928. № 8. С. 482–490.

4. Касперович Н. Краеведение у западных соседей // Советский работник. 1928. № 5–6. С. 21–24.

5. Каспяровіч М. Аб краязнаўстве на Фіншчыне // Наш край. 1928. № 4. С. 10–21.

6. Каспяровіч М. Краязнаўства. Мінск: Бел. дзярж. выдавецтва, 1929. 160 с.

*Паступіў 15.03.2014*